# МЫТНАЕ АДМІНІСТРАВАННЕ ДЗЯРЖАЎ – ЧЛЕНАЎ ЕАЭС У РАМКАХ СТРАТЭГІЧНЫХ НАПРАМКАЎ РАЗВІЦЦЯ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ ДА 2025 г.

**Д. А. Белая**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, belayaa_1903@mail.ru*

Стратэгія-2025 ЕАЭС уяўляе сабой усебаковы дакумент, які вызначае напрамкі інтэграцыйнага развіцця і фарміруе Адзіную эканамічную прастору. Яе актуальнасць вызначана адлюстраванымі ў ёй 11 сістэмнымі блокамі мер, каторыя накіраваныя на эканамічны рост і павышэнне канкурэнтаздольнасці дзяржаў – членаў ЕАЭС і каторыя надаюць пэўную ўвагу мытнаму адмініставанню як асноўнаму фактару скасавання гандлёвых бар'ераў. У дадзеным артыкуле разглядаецца працэс уніфікацыі стандартаў, сістэм кіравання рызыкамі і распрацоўка адзінага механізму падатковага ды валютнага кантролю дзеля спрашчэння працэдур для ўдзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці. Таксама паказана неабходнасць узаемадзеяння паміж органамі ЕАЭС і нацыянальнымі ўрадамі, якая заснавана на сучасных інфармацыйных тэхналогіях, дзеля комплекснай рэалізацыі Стратэгіі-2025. Адзначаецца каардынацыя дзеянняў дзяржаў – членаў ЕАЭС, распрацоўка ўзгодненых падыходаў да галіновых палітык у якасці неабходнай умовы забеспячэння эканамічнай устойлівасці ЕАЭС пры сучасных глабальных выкліках.

***Ключавыя словы:*** Еўразійскі эканамічны саюз; інтэграцыйнае развіццё; мытнае адміністраванне; макраэканамічная ўстойлівасць; лічбавізацыя кіраўніцкіх працэсаў; Стратэгія-2025; гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва.

# ТАМОЖЕННОЕ АДМИНИСТРИРОВАНИЕ ГОСУДАРСТВ – ЧЛЕНОВ ЕАЭС В РАМКАХ СТРАТЕГИЧЕСКИХ НАПРАВЛЕНИЙ РАЗВИТИЯ ЕВРАЗИЙСКОЙ ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ИНТЕГРАЦИИ ДО 2025 г.

**Д. А. Белая**

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, belayaa_1903@mail.ru*

Стратегия-2025 ЕАЭС представляет собой всесторонний документ, определяющий направления интеграционного развития и формирующий Единое экономическое пространство. Ее актуальность определена отраженными в ней 11 системными блоками мер, которые направлены на экономический рост и повышение конкурентоспособности государств – членов ЕАЭС и которые уделяют определенное внимание таможенному администрированию как основному фактору отмены торговых барьеров. В данной статье рассматривается процесс унификации стандартов, систем управления рисками и разработка единого механизма налогового и валютного контроля с целью упрощения процедур для участников внешнеэкономической деятельности. Также отражена необходимость взаимодействия между органами ЕАЭС и национальными правительствами, основанного на современных информационных технологиях, для комплексной реализации Стратегии-2025. Описывается координация действий

государств – членов ЕАЭС, разработка согласованных подходов к отраслевым политикам в качестве необходимого условия обеспечения экономической устойчивости ЕАЭС при современных глобальных вызовах.

***Ключевые слова:*** Евразийский экономический союз; интеграционное развитие; таможенное администрирование; макроэкономическая устойчивость; цифровизация.

## CUSTOMS ADMINISTRATION OF THE EAEU MEMBER STATES WITHIN THE FRAMEWORK OF THE STRATEGIC DIRECTIONS FOR DEVELOPING THE EURASIAN ECONOMIC INTEGRATION UNTIL 2025

**D. A. Belaya**

*Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, belayaa_1903@mail.ru*

The EAEU Strategy-2025 is considered to be a comprehensive document defining the directions of integration development and forming Common Economic Space. Its relevance is determined by the 11 systemic blocks of measures reflected in it, which are aimed at economic growth and increased competitiveness of the EAEU member states and which pay attention to customs administration as the main factor in the elimination of trade barriers. The article discusses the process of unification of standards, risk management systems and the development of a single mechanism of tax and currency control to simplify procedures for participants of foreign economic activity. It also illustrates the need for interaction between the EAEU bodies and national governments based on modern information technologies for the comprehensive implementation of the Strategy-2025. Moreover, coordination of actions of the EAEU member states, development of coherent approaches to sectoral policies as a necessary condition for ensuring the economic sustainability of the EAEU under the current global challenges is mentioned.

***Keywords:*** Eurasian Economic Union; integration expansion; customs administration; macroeconomic sustainability; digitalization of management processes; Strategy-2025; trade and economic cooperation.

Стратэгічныя напрамкі развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 г. (далей – Стратэгія-2025) зацверджаны Рашэннем Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ад 11.12.2020 № 121. Дадзены дакумент уяўляе сабой ключавы элемент стратэгічнага планавання для Еўразійскага эканамічнага саюза (далей – ЕАЭС) на перыяд 2020–2025 гг. Стратэгія-2025 уяўляе сабой комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне ўмоў, якія спрыяюць эканамічнаму развіццю дзяржаў – членаў ЕАЭС. Пры гэтым самім дакументам прадугледжана рэалізацыя сумесных праграм і праектаў [1]. Для дасягнення ўказаных мэтаў неабходна ажыццяўляць не толькі нацыянальныя, але і інтэграцыйныя меры ў шэрагу абласцей, сярод якіх варта адзначыць стымуляванне інвестыцыйнай дзейнасці і навукова-тэхнічнага прагрэсу, павелічэнне экспартнага патэнцыялу і ўмацаванне ўнутрырэгіянальнага гандлю, а таксама падтрыманне макраэканамічнай стабільнасці.

У кантэксце стратэгічнага планавання таксама пазначаны асноўныя напрамкі развіцця інтэграцыйнага аб'яднання, якія павінны ахопліваць накіраваныя на паглыбленне інтэграцыйных працэсаў меры ды механізмы (330 пазіцый, згрупаваныя ў 11 сістэмных блокаў, якія прадугледжваюць:

— укараненне адзіных рынкаў у сектарах з асаблівай значнасцю для краін-удзельніц ды завяршэнне фарміравання Адзінай эканамічнай прасторы;

— аптымізацыю механізмаў рэгулявання для мінімізацыі выключэнняў і абмежаванняў ды прадухілення ўзнікнення новых бар'ераў;

— распрацоўку агульнага падыходу да галіновых палітык;

— умацаванне міжнароднай правасуб'ектнасці ЕАЭС і павышэнне яго аўтарытэту на міжнароднай арэне;

— стварэнне сістэмы адказнасці, якая будзе забяспечваць кантроль за выкананнем норм права ЕАЭС) [2].

Такім чынам, Стратэгія-2025 уяўляе комплексны і дэталёва прапрацаваны план дзеянняў, накіраваны на ўмацаванне ўзаемадзеяння ў рамках ЕАЭС і павышэнне выніковасці інтэграцыйных працэсаў. Сярод ключавых задач трэба адзначаць наступныя: узмацненне прававой асновы супрацоўніцтва, паляпшэнне каардынацыі дзейнасці структур ЕАЭС, пашырэнне сферы сумеснага праектавання ды рэалізацыі праграм, забеспячэнне высокага стандарту якасці тавараў і аптымізацыю мытных працэдур. Больш за тое, у адпаведнасці са Стратэгіяй-2025 мяркуецца распрацоўка і зацвярджэнне пакета нарматыўна-прававых актаў, каторыя спрыяюць удасканаленню механізмаў функцыянавання аб'яднання. Яны накіраваныя на ліквідацыю існуючых юрыдычных неадпаведнасцяў і гарманізацыю нацыянальнага заканадаўства дзяржаў – членаў ЕАЭС. Акрамя таго, прадугледжана рэвізія і актуалізацыя дзеючых міжнародных дагавораў для прывядзення іх у адпаведнасць з эканамічнымі ўмовамі і патрабаваннямі бізнесу. Дадзеныя крокі здолеюць павысіць міжнародны аўтарытэт ЕАЭС і стымуляваць прыток інвестыцый. Аднак жа эфектыўная рэалізацыя пазначаных задач патрабуе актыўнай ўцягнутасці ўсіх зацікаўленых бакоў, таму сёння ўвага надаецца супрацоўніцтву Еўразійскай эканамічнай камісіі з дзяржаўнымі інстытутамі краін – удзельніц ЕАЭС. Распараджэннем Савета ЕЭК № 46 ад 05.04.2021 была зацверджана праграма канкрэтных мер, этапаў і адказных выканаўцаў рэалізацыі Стратэгіі-2025, каторая павінна стаць дзейсным механізмам інтэграцыі і крокам да далейшага развіцця эканомік дзяржаў – членаў ЕАЭС.

На сённяшні дзень ЕАЭС – актыўнае інтэграцыйнае аб'яднанне ў сусветнай эканоміцы, ліквідацыя бар'ераў у гандлі якога з'яўляецца адной з найбольш актуальных тэм для дзяржаў – членаў ЕАЭС. Менавіта адмена мытнага афармлення на ўнутраных межах з 2010 г. лічылася найбольш прыкметнай часткай міжурадавых пагадненняў, а даследчыкі адзначалі важнасць стварэння камфортнага ды эфектыўнага бізнес-асяроддзя ва ўсіх дзяржавах-членах ЕАЭС [2, с. 12]. Але узаемны гандаль рэгулярна сутыкаецца з цяжкасцямі, абумоўленымі наяўнасцю перашкод з боку

органаў улады, што выкліканыя недастатковасцю мер па забеспячэнні эфектыўнай працы механізмаў кантролю пры імпарце прадукцыі замежнага паходжання ў ЕАЭС. Такія абставіны ў доўгатэрміновай перспектыве ствараюць умовы для неэфектыўнага перамяшчэння тавараў, а пазбаўленне ад існуючых абмежаванняў ды дасягненне ўнутранага рынкавага адзінства патрабуюць укаранення адзінага дзейснага механізму мытнага рэгулявання на знешніх межах ЕАЭС. Пытанне выходзіць за межы тэхнічнай плоскасці, таму што з'яўляецца адным з асноватворных фактараў паспяховай эканамічнай інтэграцыі. Пры гэтым наяўнасць парушэнняў ва ўказанай сферы вядзе да значных скажэнняў ва ўзаемным гандлі, запавольвае ўсе інтэграцыйныя працэсы ды зніжае магчымасці супрацоўніцтва ў развіцці цэлага шэрагу перспектыўных прамысловых сектараў эканомікі.

Мытныя службы дзяржаў – членаў ЕАЭС гуляюць ключавую ролю ў падтрыманні эканамічнай устойлівасці інтэграцыйнага аб'яднання. Іх дзейнасць як арыентавана на абарону нацыянальных інтарэсаў кожнай дзяржавы, так і спрыяе агульнаму росквіту рэгіёну [3, с. 111]. У Стратэгіі-2025 асаблівая ўвага надаецца наступным напрамкам:

— ліквідацыя ўнутрысаюзных гандлёвых бар'ераў праз забеспячэнне свабоднага перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталу ды працоўнай сілы пры мінімальнай рэгламентацыі;

— павышэнне канкурэнтаздольнасці і эфектыўнасці функцыянавання таварных рынкаў праз спрыяльныя ўмовы стабільнага эканамічнага росту ва ўсіх краінах – удзельніцах ЕАЭС;

— удасканаленне механізму мытнага адміністравання праз увядзенне агульных нормаў і працэдур.

Таксама важна адзначыць, што асаблівае значэнне мае фарміраванне адзінага стандарту арганізацыі мытна-тарыфных аперацый і кантрольных мерапрыемстваў. Дадзены стандарт, вызначаны ў пункце 3.2 Стратэгіі-2025, уключае яшчэ і ўніфікацыю ды імплементацыю сістэм кіравання рызыкамі. Сістэма паказчыкаў, прызначаная для ацэнкі дасягнення гэтага стандарту, павінна быць арыентавана на вырашэнне двух узаемазвязаных задач, якія актуальныя для мытнага адміністраравання. Пакуль першая заключаецца ў спрошчанні і паскарэнні арганізацыйных і кантрольных працэдур для паставак, у адносінах да якіх не выяўлены значныя рызыкі парушэння мытнага заканадаўства; другая – гэта эфектыўнае выяўленне і спыненне правапарушэнняў [4, с. 15].

Пры аналізе вызначэння, зместу і паказчыкаў, якія характарызуюць дасягненне такога стандарту, трэба ўлічваць менавіта іх сувязь з сістэмай паказчыкаў, каторыя адлюстроўваюць дзейнасць мытных органаў ЕАЭС і якасць мытнага адміністраравання ў цэлым. У адпаведнасці з мэтавымі ўстаноўкамі Сусветнай мытнай арганізацыі, значнай ўмовай ўстойлівага росту міжнароднага гандлю і нацыянальных эканомік выступае паказчык эфектыўнасці мытнай сістэмы, аб'ектыўная ацэнка якога праводзіцца па шэрагу ключавых паказчыкаў:

— гарманізацыя і аптымізацыя мытных аперацый і працэдур, у тым ліку скарачэнне часу афармлення ды ліквідацыя адміністрацыйных перашкод для суб'ектаў знешнеэканамічнай дзейнасці, паляпшэнне ўмоў выхаду на міжнародныя рынкі ды празрыстасць адпаведных нарматыўных патрабаванняў;

— карэктнае забеспячэнне фіскальнай функцыі дзяржавы: своечасовыя паступленні мытных пошлін і падатковых плацяжоў у дзяржаўную казну, кантроль над правільнасцю разліку мытных узносаў;

— ахова грамадскіх інтарэсаў, якая павінна ўключаць прадухіленне паступлення на рынак ЕАЭС небяспечных тавараў;

— інстытуцыйнае развіццё мытнай сістэмы.

Далейшае ўдасканаленне мытнага адміністравання павінна грунтавацца на прынцыпе максімальнага спрашчэння і паскарэння мытных аперацый для добрасумленных удзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці [5, с. 254]. Больш за тое, мэтазгодным будзе кантрольныя мерапрыемствы канцэнтраваць на нядобрасумленных удзельніках тавараабароту.

Для дасягнення такіх мэтаў неабходны адзіны механізм падатковага, мытнага адміністраравання і валютнага кантролю, які будзе абапірацца на інавацыйных тэхналогіях і якія створыць умовы для пераходу да выплаты ўвазных мытных пошлін і падаткаў пасля выпуску тавараў. Сама сістэма «адзінага акна» спрыяе спрашчэнню мытнага афармлення тавараў, пры гэтым забяспечвае аператыўнае праходжанне ўсіх этапаў ўзаемадзеяння бізнесу з дзяржаўнымі структурамі [6, с. 27]. Прымяненне сучасных тэхналогій і працэсаў лічбавізацыі павышае эфектыўнасць мытных органаў, скарачае затраты на правядзенне праверак і павялічвае празрыстасць аперацый, што дазваляе праводзіць эксперыменты ды ўкараняць пілотныя праекты, накіраваныя на аптымізацыю мытных аперацый не толькі з боку мытных органаў, але ж і на скарачэнне выдаткаў суб'ектаў знешнеэканамічнай дзейнасці. 01.09.2020 г. пачалася практычная рэалізацыя аднаго з такіх пілотных праектаў, што быў створаны для здзяйснення мытных аперацый у рэгіянальным цэнтры электроннага дэкларавання (яго асаблівасцю стала ўжыванне тэхналогіі аддаленага выпуску тавараў ды механізму аўтаматычнага размеркавання мытных дакументаў паміж пунктамі мытнага афармлення і службовымі асобамі пунктаў мытнага афармлення). Такія мерапрыемствы накіраваны на паскарэнне самога працэсу мытнага афармлення і спыненне пападання кантрафактных тавараў у ЕАЭС, зніжэнне іх абароту на мытнай тэрыторыі Саюза з дапамогай выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Такім чынам, Стратэгія-2025 уяўляе ключавы элемент забеспячэння як устойлівага, так і збалансаванага развіцця эканамічнай інтэграцыі, пры гэтым спрыяе эканамічнаму прагрэсу ЕАЭС і ўмацаванню яго пазіцый. Вострая неабходнасць распрацоўкі, узгаднення, выкарыстоўвання сістэмы кантрольных паказчыкаў дзейнасці мытных органаў заключаецца ў магчымасці сбалансавана ацаніць ступень дасягнення пастаўленых мэтаў ды скарэктаваць працэс іх рэалізацыі пры такой патрэбе.

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. О Стратегических направлениях развития евразийской экономической интеграции до 2025 г.: решение Высш. Евраз. экон. совета от 11 дек. 2020 г. № 12 // Евразийская экономическая комиссия. – URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=F92000439 (дата обращения: 18.02.2025).

2. Давыдов, Р. В. Единый стандарт таможенного администрирования как инструмент развития Евразийского экономического союза / Р. В. Давыдов // Вестн. Рос. тамож. акад. — 2020. — № 4. – С. 9–18. – ГКДЖ http://limited.academy.customs.gov.ru/storage/document_text/2021/02-01/3YWJpbEw/2020%204_biblio.pdf (дата обращения: 18.02.2025).

3. Дорожкина, Т. В. Роль таможенных органов в создании благоприятного бизнес-климата на территории ЕАЭС / Т. В. Дорожкина, К. В. Полякова // Modern Economy Success. — 2020. — № 2. – С. 110–114. — URL: https://www.elibrary.ru/item.asp?id=42758582 (дата обращения: 19.02.2025).

4. Исследование роли таможенных органов стран ЕАЭС в обеспечении экономической безопасности национальных государств и интеграционного объединения в целом / Р. А. Лаптев, В. В. Коварда, Е. А Болычева // Вестн. Евраз. науки. — 2021. — Т. 13, № 2. – URL: https://esj.today/PDF/48ECVN221.pdf (дата обращения: 18.02.2025).

5. Перемещение товаров и транспортных средств через таможенную границу ЕАЭС: проблемы современного администрирования / Т. В. Дорожкина, Ю. А. Чунина, А. К. Кучерявенко // Russian Economic Bulletin. — 2021. — Т. 4, № 2. – С. 252–255. — URL: https://www.elibrary.ru/item.asp?id=45834306 (дата обращения: 18.02.2025).

6. Гончаров, А. Развитие цифровых технологий таможенного регулирования внешнеэкономической деятельности на пространстве ЕАЭС / А. Гончаров, А. Иншакова // Право и управление. XXI век. — 2021. — Т. 17, № 2. – С. 23–32. — URL: http://pravo.mgimo.ru/sites/default/files/pdf/03_goncharovai_inshakovao.pdf (дата обращения: 19.02.2025).